ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
07.08.2025 № 140

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
# «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі»
# для X класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

(павышаны ўзровень)

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні ў X класе ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 136 гадзін (4 гадзіны на тыдзень, рэзервовы час – 1 гадзіна).

Педагагічны работнік мае права з улікам пазнавальных магчымасцей вучняў змяніць колькасць вучэбных гадзін і паслядоўнасць вывучэння матэрыялу ў межах вучэбнага часу, прызначанага для засваення зместу вучэбных тэм. Рэзервовы час можа быць выкарыстаны для кантролю ведаў і ўменняў вучняў.

На павышаным узроўні вывучэння вучэбнага прадмета прадугледжаны час на арганізацыю праектнай дзейнасці вучняў.

3. Мэты навучання вучэбнаму прадмету «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» на павышаным узроўні:

навучанне, развіццё і выхаванне асобы вучня на аснове асэнсавання ім гістарычнага вопыту беларускай нацыі ў кантэксце гісторыі чалавецтва, фарміравання сістэмы гістарычных ведаў, традыцыйных каштоўнасцей, гістарычнай памяці, нацыянальна-культурнай і грамадзянскай ідэнтычнасці, якія забяспечваюць эфектыўнае прымяненне гістарычных ведаў і ўменняў у вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, у сацыяльных практыках;

забеспячэнне засваення вучнямі кампетэнцый, неабходных для прафесійнага самавызначэння, працягу адукацыі па выбраным напрамку.

4. Задачы навучання вучэбнаму прадмету «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» на павышаным узроўні:

сістэматызацыя і абагульненне ведаў аб гісторыі Беларусі з найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст. у кантэкстуальным адзінстве з асноўнымі тэндэнцыямі сусветнага грамадска-гістарычнага працэсу; асэнсаванне вучнямі гістарычнага працэсу, разуменне імі заканамернасцей, тэндэнцый гістарычнага развіцця і месца Беларусі ў гістарычным працэсе;

фарміраванне светапоглядных перакананняў і каштоўнасных арыентыраў вучняў на аснове засваення імі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як часткі сусветнай спадчыны, фарміравання гістарычнай памяці і нацыянальнай ідэнтычнасці, прыняцця і прытрымлівання ідэй патрыятызму, грамадзянскай супольнасці, прававой дзяржавы;

развіццё гістарычнага мыслення вучняў, удасканаленне агульнавучэбных і спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для самастойнага пазнання гістарычнай рэчаіснасці, прымянення гістарычных ведаў у сучаснай сацыяльнай практыцы; свядомага прафесійнага самавызначэння і працягу адукацыі па выбраным напрамку.

5. У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу рэкамендуецца выкарыстоўваць прадуктыўныя, часткова-пошукавыя (эўрыстычныя), праблемнага выкладу, даследчыя (практычныя) метады.

Рэкамендаваныя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці: асэнсаванае ўзнаўленне тэарэтычнага і факталагічнага вучэбнага матэрыялу, работа з рознымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі; лакалізацыя гістарычных працэсаў, з'яў і падзей у часе і прасторы; перакадзіраванне вербальнай інфармацыі ў наглядна-вобразную і наадварот; распрацоўка вучэбных праектаў, іншыя.

Для адпрацоўкі прадугледжаных дадзенай вучэбнай праграмай відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці рэкамендуецца выкарыстоўваць урокі-практыкумы.

Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае правядзенне ўрокаў «Наш край». Мэта гэтых урокаў – пазнаёміць вучняў з асаблівасцямі гістарычнага развіцця свайго рэгіёна. Пры вывучэнні краязнаўчага матэрыялу рэкамендуецца выкарыстоўваць гісторыка-дакументальную хроніку «Памяць»; праводзіць экскурсіі ў музеі і іншыя ўстановы, арганізоўваць даследчую дзейнасць вучняў.

Выбар метадаў навучання і выхавання, відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, іх узроставых і індывідуальных пазнавальных асаблівасцей.

6. Чаканыя вынікі асваення дадзенай вучэбнай праграмы:

6.1. асобасныя вынікі навучання арыентаваны на фарміраванне жыццёвага вопыту, светапогляду, асобаснай і грамадзянскай пазіцыі, каштоўнасных арыентыраў асобы. Асобасныя вынікі засваення зместу дадзенай вучэбнай праграмы выяўляюцца ў тым, што вучань:

кіруецца ў сваіх паводзінах традыцыйнымі каштоўнасцямі, прынятымі ў сучасным беларускім грамадстве;

валодае нацыянальнай самасвядомасцю, пачуццём патрыятызму;

дэманструе сацыяльна актыўныя і адказныя паводзіны;

праяўляе гатоўнасць і здольнасць да ўзаемаразумення, дыялогу і супрацоўніцтва;

6.2. метапрадметныя вынікі навучання выяўляюцца ў тым, што вучань:

вызначае мэты свайго навучання, фармулюе суб’ектыўна новыя задачы ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

самастойна арганізуе сваю дзейнасць, плануе ўласныя вучэбныя дасягненні;

ажыццяўляе пазнавальную вучэбную дзейнасць на аснове сфарміраваных агульнавучэбных навыкаў;

валодае лагічнымі аперацыямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, устанаўлення аналогій і прычынна-выніковых сувязей паміж фактамі, доказу і абвяржэння;

рацыянальна тлумачыць на аснове сфармаваных ведаў і аналізу ўласнага вопыту з’явы і падзеі сучаснага жыцця;

крытычна ўспрымае інфармацыю, атрыманую з розных крыніц, пісьменна інтэрпрэтуе і выкарыстоўвае яе ў адукацыйных і агульнакультурных мэтах;

удзельнічае ў праектнай дзейнасці ў камандзе або індывідуальна; публічна прадстаўляе распрацаваныя праекты, ацэньвае вынікі сумеснай дзейнасці і асабісты ўклад у дасягненне пастаўленых задач;

6.3. у адпаведнасці з прадметнымі вынікамі навучання вучням трэба засвоіць тэарэтычныя веды, якія характарызуюць гістарычны працэс у цэлым і розныя бакі грамадскага развіцця; найбольш істотныя прычынна-выніковыя сувязі; асноўныя гістарычныя паняцці ў іх сістэме і ўзаемасувязі.

Прадметныя вынікі навучання прадстаўлены ў «Асноўных патрабаваннях да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў» і сфармуляваны ў главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы.

7. Змест навучання па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» пабудаваны ў адпаведнасці з канцэнтрычным прынцыпам, што прадугледжвае засваенне зместу вучэбнага матэрыялу ў X класе на праблемна-тэарэтычным узроўні.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў X КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### УВОДЗІНЫ (3 гадзіны)

Гісторыя як навука. Функцыі гісторыі. Сэнс гісторыі. Заканамернасці гістарычнага развіцця. Гістарычны факт і гістарычная крыніца. Паняцце

«цывілізацыя». Перыядызацыя гісторыі. Суадносіны перыядызацыі айчыннай і сусветнай гісторыі.

Урок-практыкум.

## СТАНАЎЛЕННЕ НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. БЕЛАРУСЬ У ДАДЗЯРЖАЎНЫ ПЕРЫЯД (20 гадзін)

Паходжанне чалавека, прырода і людзі. Праблема паходжання чалавека. Прарадзіма чалавека. Эвалюцыя чалавека, фактары, якія яе абумовілі. Змяненні клімату і ландшафту. Рассяленне людзей на кантынентах Зямлі. З’яўленне людзей на тэрыторыі Беларусі. Асваенне чалавекам тэрыторыі Беларусі. Калектывы старажытных людзей.

Эвалюцыя грамадства і эканомікі ў старажытнасці. Перыядызацыя гісторыі першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Перыядызацыя старажытнай гісторыі чалавецтва. Удасканаленне прылад працы і тэхналогій. Неалітычная рэвалюцыя. Наступствы пераходу да вытворчай гаспадаркі. Адкрыццё металургіі і яе значэнне. Беларускія землі ў эпоху неаліту.

Прычыны і значэнне міграцый насельніцтва. Індаеўрапейская экспансія на тэрыторыі Беларусі. Бронзавы і жалезны вякі на тэрыторыі Беларусі. Ад радавой абшчыны да суседскай. Дасягненні першабытнай эпохі.

Старажытныя вераванні і мастацтва. Асаблівасці светапогляду старажытных людзей. Прыклады мастацтва на тэрыторыі Беларусі і ў свеце. Першабытныя вераванні. Рэлігійныя ўяўленні насельніцтва Беларусі ў першабытную эпоху. Змяненне светапогляду ў неаліце і бронзавым веку. Зараджэнне мастацтва. Мастацтва бронзавага і жалезнага вякоў. Матэрыяльная і духоўная культура насельніцтва Беларусі. Паўсядзённае жыццё насельніцтва беларускіх земляў у першабытную эпоху.

Асаблівасці старажытных цывілізацый. Узнікненне першых лакальных цывілізацый у свеце. Рабства ў старажытных цывілізацыях. Рабаўладальніцкі лад. Асаблівасці арганізацыі ўлады, грамадства і эканомікі Старажытнага Усходу. Гарады-дзяржавы і старажытныя імперыі. Арганізацыя старажытнагрэчаскага поліса. Старажытнарымская абшчына і дзяржаўная ўлада. Беларускія землі ў эпоху антычнасці. Селішчы рымскага часу на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя культурныя дасягненні старажытных цывілізацый. З’яўленне манатэізму. Узнікненне хрысціянства. Уплыў старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай культуры на сярэднявечную Еўропу.

Урок-практыкум.

Урок абагульнення.

Урок «Наш край».

Праектная дзейнасць.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнні паняццяў: антычнасць, дзяржава, дэспатыя, імперыя, гістарычная памяць, гістарычная крыніца, гістарычны факт, манатэізм, міфалогія, неалітычная рэвалюцыя, язычніцтва, патрыярхальнае рабства, першабытнае грамадства, радавая абшчына, рабаўладальніцкі лад, рэлігія, старажытнагрэчаскі поліс; суседская абшчына, цывілізацыя;

храналагічныя рамкі каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў, гісторыі Старажытнага свету;

асноўныя працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця першабытнага грамадства і іх асаблівасці на тэрыторыі Беларусі;

асаблівасці арганізацыі ўлады, грамадства і эканомікі ў старажытных цывілізацыях;

асаблівасці паўсядзённага жыцця найстаражытнейшага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі;

асноўныя дасягненні першабытнага грамадства, культурную спадчыну старажытных цывілізацый;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаемыя гістарычныя падзеі, з’явы, працэсы;

сінхранізаваць з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў вывучаемы перыяд;

лакалізаваць у прасторы рэгіёны з’яўлення першых людзей і працэс засялення тэрыторыі Беларусі; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з’явах, працэсах;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: антычнасць, дзяржава, дэспатыя, імперыя, гістарычная памяць, гістарычная крыніца, гістарычны факт, манатэізм, міфалогія, неалітычная рэвалюцыя, язычніцтва, патрыярхальнае рабства, першабытнае грамадства, радавая абшчына, рабаўладальніцкі лад, рэлігія, старажытнагрэчаскі поліс; суседская абшчына, цывілізацыя; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных падзей, з’яў і працэсаў;

характарызаваць умовы жыцця і гаспадарчую дзейнасць першабытных людзей, палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё старажытных дзяржаў з апорай на розныя крыніцы інфармацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі: прычыны і наступствы неалітычнай рэвалюцыі, прычыны і наступствы міграцый насельніцтва, прычыны і наступствы ўзнікнення рэлігійных вераванняў;

параўноўваць гістарычныя факты, звязаныя з развіццём першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі і іншых тэрыторыях па самастойна выбраных крытэрыях; фармуляваць аргументаваныя высновы аб месцы гісторыі Беларусі ў сусветнай гісторыі;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання па пытаннях эвалюцыі гаспадарчай дзейнасці і сацыяльнай структуры першабытнага грамадства і старажытных цывілізацый;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб развіцці першабытнага грамадства і старажытных цывілізацый па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі.

Ужываць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з’яў, працэсаў;

рашэнні вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, даследчых работ, апісання і тлумачэння іх вынікаў;

усвядомленых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай агульнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

## СВЕТ У ЭПОХУ РАННЯГА І ВЫСОКАГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (35 гадзін)

Дзяржавы Ранняга і Высокага сярэднявечча на Захадзе. Вялікае перасяленне народаў. Асаблівасці грамадскага развіцця германскіх плямёнаў у першыя стагоддзі новай эры. Рассяленне германскіх плямёнаў у Еўропе і Паўночнай Афрыцы. Утварэнне варварскіх каралеўстваў. Новая палітычная карта Еўропы. Асаблівасці развіцця дзяржаў заходніх і паўднёвых славян. Візантыйская імперыя і яе ўплыў на славянскія народы. Асаблівасці еўрапейскіх дзяржаў Ранняга і Высокага сярэднявечча.

Еўрапейскае грамадства ў Раннім і Высокім сярэднявеччы. Сутнасць феадальных адносін у Еўропе. Асноўныя рысы феадальнага грамадства.

Шляхі фармавання феадалізму ў Еўропе. Феадальная іерархія. Прычыны феадальнай раздробненасці. Саслоўі феадальнага грамадства. Аграрная вытворчасць. Натуральная гаспадарка. Роля гарадоў у феадальным грамадстве. Карпаратыўны прынцып арганізацыі эканамічнай дзейнасці ў гарадах. Развіццё рамяства і гандлю.

Палітычнае і сацыяльнае развіццё дзяржаў Азіі, Трапічнай Афрыкі і Амерыкі ў перыяд Ранняга і Высокага Сярэднявечча. Палітычная карта Азіі. Арабскія заваяванні і іх наступствы. Асаблівасці арганізацыі ўлады і кіравання ў Багдадскім халіфаце. Заваяванні мусульманамі Індыі. Асаблівасці палітычнай сітуацыі ў Кітаі. Дзяржаўны лад у сярэднявечных цывілізацыях Азіі. Узаемаадносіны ўлады і насельніцтва. Традыцыйнае грамадства. Асаблівасці сацыяльнай структуры грамадства ў краінах Азіі. Роля абшчыны.

Асаблівасці сельскагаспадарчай вытворчасці на Усходзе. Развіццё рамёстваў і гандлю. Вялікі шаўковы шлях і яго значэнне. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця цывілізацый Трапічнай Афрыкі і Амерыкі.

Рэлігіі ў жыцці сярэднявечных грамадстваў. Хрысціянізацыя Еўропы. Царкоўная арганізацыя. Становішча царквы ў Візантыі. Узаемаадносіны свецкай і царкоўнай улады. Раскол хрысціянскай царквы. Узмацненне ролі папства. Духоўна-рыцарскія ордэны. Роля хрысціянства ў развіцці сярэднявечнай заходнееўрапейскай культуры. Рэлігіі ў сярэднявечных цывілізацыях Азіі. Канфесіі на тэрыторыі Беларусі. Рэлігіі Афрыкі і Амерыкі.

Развіццё культуры ў Раннім і Высокім сярэднявеччы. Захаванне антычнай спадчыны. Сярэднявечная адукацыя. Развіццё культуры ў Заходняй Еўропе. Дасягненні ў навуцы і культуры Візантыі. Светаўспрыманне еўрапейцаў у Сярэднія вякі. «Мусульманскі рэнесанс». Светаўспрыманне і побыт пазаеўрапейскіх цывілізацый. Уплыў ісламскай культуры на сярэднявечную Еўропу.

Вялікая славянская міграцыя і Беларусь. Праблема паходжання славян. Прарадзіма славян. Рассяленне славян. Шляхі міграцыі славян ва Ўсходняй Еўропе. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. Узаемадзеянне славян з мясцовымі народамі. Славянскія саюзы плямёнаў. Племянныя княжанні ўсходніх славян.

Старажытная Русь – дзяржава ўсходніх славян. Першыя пераддзяржаўныя ўтварэнні ўсходніх славян. Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы. Старажытная Русь на палітычнай карце сярэднявечнай Еўропы. Беларускія землі ў Старажытнарускай дзяржаве.

Княжацкая ўлада. Палітыка першых усходнеславянскіх князёў. Эканамічнае, палітычнае і культурнае ўзаемадзеянне Старажытнарускай

дзяржавы з Візантыяй. Росквіт Старажытнай Русі. Палітычная раздробненасць Старажытнай Русі, яе прычыны і наступствы.

Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. Утварэнне Полацкага княства. Фарміраванне тэрыторыі Полацкага княства. Дзейнасць полацкіх князёў па ўмацаванні дзяржавы. Прычыны і змест канфліктаў з кіеўскімі князямі. Тураўскае княства. Асаблівасці дзяржаўнага ладу Полацкага і Тураўскага княстваў. Асаблівасці палітычнага развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў у XI ст. Раздробненасць Полацкага і Тураўскага княстваў. Асаблівасці становішча Гарадзенскага княства. Беларускія землі ў складзе Смаленскай, Чарнігаўскай, Кіеўскай і Валынскай зямель.

Барацьба са знешнімі заваёўнікамі. Качэўнікі Паўночнага Прычарнамор’я. Барацьба Старажытнай Русі з качавымі плямёнамі. Полацкія князі ў войнах з качэўнікамі. Мангольскае нашэсце на Усходнюю Еўропу і яго наступствы. Ардынскае ярмо. Нямецкая экспансія ва Усходняй Прыбалтыцы. Барацьба з крыжакамі.

Грамадства і эканоміка беларускіх зямель у IX–XIII стст. Структура грамадства. Роля абшчыны. Асаблівасці развіцця гаспадаркі. Удасканаленне прылад працы і сістэм земляробства. Развіццё рамёстваў. Дасягненні ўсходнеславянскіх рамеснікаў. Шляхі ўзнікнення і функцыі старажытных гарадоў Беларусі. Характар і змест гандлю. Найважнейшыя гандлёвыя шляхі. Міжнародны гандаль. Зараджэнне феадальных адносін.

Распаўсюджванне хрысціянства на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці язычніцкага светапогляду. Язычніцкія свяцілішчы. Славянскія язычніцкія багі. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства на Русі. Фарміраванне царкоўнай арганізацыі. Полацкая і Тураўская епархіі. Суіснаванне язычніцтва і хрысціянства. Адлюстраванне язычніцкага светапогляду ў паўсядзённым жыцці. Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць у XII ст. Еўфрасіння Полацкая. Кірыла Тураўскі. Значэнне прыняцця хрысціянства.

Культура Беларусі ў IX–XIII стст. Пісьменнасць. Рукапісныя кнігі. Летапісанне. Вусная народная творчасць. Характэрныя рысы архітэктуры. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Урок-практыкум.

Урок абагульнення.

Урок «Наш край».

Праектная дзейнасць.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: Вялікае перасяленне народаў, дзяржаўная рэлігія, дваяверства, натуральная гаспадарка, прыгоннае права, Рэканкіста, славянізацыя балтаў, саслоўе, Сярэднявечча, тэакратыя, традыцыйнае грамадства, феадалізм, феадальная іерархія, феадальная раздробненасць, халіфат;

храналагічныя рамкі Вялікага перасялення народаў, рассялення славян, фарміравання дзяржаўнасці, распаўсюджвання хрысціянства на тэрыторыі Беларусі;

асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага развіцця Беларусі ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча;

культурную спадчыну Беларусі, іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаемыя падзеі, з’явы, працэсы;

сінхранізаваць падзеі, з’явы, працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў вывучаемы перыяд;

лакалізаваць у прасторы працэсы развіцця дзяржаўнасці, культуры, эканомікі на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: Вялікае перасяленне народаў, дзяржаўная рэлігія, дваяверства, натуральная гаспадарка, прыгоннае права, Рэканкіста, славянізацыя балтаў, саслоўе, Сярэднявечча, тэакратыя, традыцыйнае грамадства, феадалізм, феадальная іерархія, феадальная раздробненасць, халіфат; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў і працэсаў);

характарызаваць асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага, канфесійнага развіцця Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў Раннім і Высокім сярэднявеччы з апорай на розныя крыніцы інфармацыі, месца Беларусі ў гэтых працэсах; пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі з’явамі і працэсамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча;

параўноўваць гістарычныя з’явы і працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча, па самастойна выбраных крытэрыях і фармуляваць аргументаваныя высновы;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання аб палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб развіцці Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесінальным і культурным развіцці Беларусі ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча, гістарычных асобах, падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт (далей – інтэрнэт) і іншых);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях развіцця Беларусі ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча і яе месцы ў сусветным гістарычным працэсе;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у сродках масавай інфармацыі (далей – СМІ);

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных фактаў і асоб;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, даследчых работ, апісання і тлумачэння іх вынікаў;

усвядомленых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай агульнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

## РАЗВІЦЦЁ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ У ПОЗНІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА І ЖАМОЙЦКАГА (31 гадзіна)

Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый у Познім сярэднявеччы. Стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў у Заходняй Еўропе. Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў. Візантыя ў перыяд Позняга сярэднявечча. Прыклады форм праўлення – манархій і рэспублік у заходне-і ўсходнееўрапейскім рэгіёнах. Асаблівасці утварэння расійскай

дзяржаўнасці. Усходнія дэспатыі. Асаблівасці развіцця дзяржаў на Усходзе. Палітычная карта Еўропы і свету ў канцы Сярэднявечча.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё цывілізацый у Познім сярэднявеччы. Уплыў таварна-грашовых адносін на сацыяльную структуру еўрапейскага феадальнага грамадства. Фарміраванне адзінага дваранскага саслоўя. Вызваленне сялян ад асабістай залежнасці. Эканамічныя змены ў сярэднявечным горадзе. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Усходу.

Духоўнае развіццё цывілізацый у Познім сярэднявеччы. Роля царквы ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці еўрапейскіх дзяржаў. Значэнне рэлігіі для этнічнай кансалідацыі. Ерасі. Заняпад папства. Гусіцкі рух. Іудаізм у эпоху Сярэднявечча. Асаблівасці рэлігій Усходу. Значэнне рэлігіі для этнічнай кансалідацыі. Культура ў другой палове XIII – XV ст. Дасягненні ў навуцы і культуры Індыі, Кітая і Японіі.

Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), дзейнасць вялікіх князёў па ўмацаванні дзяржавы. Палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе ў сярэдзіне XIII ст. Прычыны ўтварэння новай дзяржавы. Шляхі ўваходжання ўсходнеславянскіх земляў у новую дзяржаву. Дзейнасць вялікіх князёў па фарміраванні тэрыторыі дзяржавы. Значэнне старажытнарускай спадчыны ў арганізацыі ВКЛ.

Дзяржаўны лад і сістэма кіравання. Унутрыпалітычная барацьба ў ВКЛ у канцы XIV ст. Узмацненне вялікакняжацкай улады падчас праўлення Вітаўта. Барацьба за ўладу пасля смерці Вітаўта. Змены ў дзяржаўным кіраванні ў канцы XV ст., пераход да саслоўна-прадстаўнічай манархіі. Заканадаўства.

Знешняя палітыка ВКЛ. Крэўская унія і яе наступствы. Барацьба з крыжакамі. Грунвальдская бітва і яе значэнне. Прычыны сутыкнення інтарэсаў ВКЛ і Маскоўскага вялікага княства.

Развіццё феадальных адносін у ВКЛ. Пазямельныя адносіны ў ВКЛ. Саслоўі феадальнага грамадства: правы, абавязкі і прывілеі. Узнікненне буйных зямельных уладанняў. Шляхі фарміравання залежнага сялянства. Пачатак запрыгоньвання сялян на тэрыторыі Беларусі.

Развіццё гарадоў, рамёстваў і гандлю на тэрыторыі Беларусі. Развіццё беларускіх гарадоў і мястэчак. Распаўсюджанне магдэбургскага права. Гарады – цэнтры рамяства і гандлю. Беларусь у сістэме еўрапейскіх эканамічных сувязей.

Рэлігійнае жыццё на тэрыторыі Беларусі. Поліканфесійны характар грамадства ВКЛ. Праваслаўная царква ў ВКЛ. Змяненне рэлігійнай палітыкі ў ВКЛ пасля заключэння Крэўскай уніі. Распаўсюджванне каталіцызму. Спробы заключэння царкоўнай уніі. Этнічныя і рэлігійныя групы ВКЛ.

Культура Беларусі ў другой палове XIII – XV ст. Культурныя працэсы ў ВКЛ ў другой палове XIII – XV ст. Культавае і абарончае дойлідства. Беларуска-літоўскае летапісанне. Літаратура. Забавы і святы.

Фарміраванне беларускай народнасці. Умовы фарміравання беларускай народнасці. Складванне этнічнай тэрыторыі. Фарміраванне этнічнай самасвядомасці. Саманазвы беларусаў. Гіпотэзы паходжання назвы «Белая Русь». Старабеларуская мова. Паўсядзённае жыццё і побыт насельніцтва Беларусі. Адзінства матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай народнасці.

Урок-практыкум.

Урок абагульнення.

Урок «Наш край».

Праектная дзейнасць.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: магдэбургскае права, мануфактруа, народнасць, прывілей, сейм, саслоўна-прадстаўнічая манархія, унія, цэнтралізаваная дзяржава, этнас, этнічная самасвядомасць;

асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага развіцця Беларусі ў перыяд Позняга сярэднявечча;

культурную спадчыну Беларусі, іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Позняга сярэднявечча;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаемыя падзеі, з’явы, працэсы;

сінхранізаваць падзеі, з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў вывучаемы перыяд;

лакалізаваць у прасторы гістарычныя падзеі, з’явы, працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў перыяд Позняга сярэднявечча; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Позняга сярэднявечча;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: магдэбургскае права, мануфактруа, народнасць, прывілей, сейм, саслоўна-прадстаўнічая манархія, унія, цэнтралізаваная дзяржава, этнас, этнічная самасвядомасць; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў і працэсаў);

характарызаваць палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, канфесійнае, культурнае развіццё Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў Познім сярэднявеччы, вынікі дзейнасці гістарычных асоб з апорай на розныя крыніцы інфармацыі, месца Беларусі ў гэтых працэсах; пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі з'явамі і працэсамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў перыяд Позняга сярэднявечча;

параўноўваць гістарычныя з'явы і працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў перыяд Позняга сярэднявечча, па самастойна выбраных крытэрыях і фармуляваць аргументаваныя вывады;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання аб палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесійным, культурным развіцці Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў Познім сярэднявеччы;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб развіцці Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў перыяд Позняга сярэднявечча па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесійным і культурным развіцці Беларусі ў перыяд Позняга сярэднявечча, гістарычных асобах, падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, інтэрнэту і іншых);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях развіцця Беларусі ў перыяд Позняга сярэднявечча і яе месцы ў сусветным гістарычным працэсе;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у СМІ;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных фактаў і асоб;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, даследчых работ, апісання і тлумачэння іх вынікаў;

усвядомленых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай агульнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

# БЕЛАРУСЬ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СВЕТУ Ў ПЕРЫЯД РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ (45 гадзін)

Каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў. Вялікія геаграфічныя адкрыцці і пачатак еўрапейскага каланіялізму. Характар узаемадзеяння Еўропы і іншых цывілізацый свету пасля вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Стварэнне Іспанскай і Партугальскай каланіяльных імперый. Каланіяльная экспансія Англіі і Францыі. Асноўныя наступствы еўрапейскага каланіялізму.

Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый свету ў XVI–XVIII стст. Фарміраванне абсалютызму ў заходнееўрапейскіх дзяржавах і Расіі. Асаблівасці ваенных канфліктаў у Новы час. Трыццацігадовая вайна і яе ўплыў на міжнародныя адносіны ў Еўропе. Сутыкненне цывілізацый Захаду і Усходу. Супрацьстаянне Еўропы і Асманскай імперыі. Варыянты адказаў на выклікі Захаду. Самаізаляцыя Японіі і Кітая. Рысы феадальнай арганізацыі ўлады.

Рэвалюцыйныя ўзрушэнні ў першы перыяд Новага часу. Наступствы рэвалюцый, іх гістарычнае значэнне. Вайна за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній. Утварэнне Злучаных Штатаў Амерыкі. Новая арганізацыя ўлады. Перанос рэвалюцыйных пераўтварэнняў у суседнія дзяржавы.

Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця цывілізацый свету. Асаблівасці эканамічнага развіцця і сацыяльных адносін ва ўсходніх і заходніх цывілізацыях. Пачатак капіталізму ў Заходняй Еўропе. Першапачатковае назапашванне капіталу. Аграрны пераварот. Рост мануфактурнай вытворчасці. Пачатак прамысловага перавароту. Захоп кантролю над знешнім гандлем усходніх краін еўрапейцамі. Змяненне характару і зместу знешняга гандлю еўрапейскіх дзяржаў. Месца ўсходнееўрапейскага рэгіёна ў міжнародным гандлі.

Гуманізм і Адраджэнне. Гуманізм як філасофская аснова Адраджэння. Асноўныя этапы эпохі Адраджэння. Чалавек як цэнтральная постаць у культуры Адраджэння. Сацыяльна-палітычная думка. Фарміраванне навуковай карціны свету. Найважнейшыя дасягненні навуковай думкі XIV–XVI стст. Праяўленне гуманістычных ідэй у грамадска-палітычнай думцы Расійскай дзяржавы. Уклад ураджэнцаў Беларусі ў развіццё навукі і культуры. Культура Усходу ў XIV–XVI стст.

Рэфармацыя. Рэлігійныя войны ў Заходняй Еўропе. Контррэфармацыя. Перадумовы і прычыны Рэфармацыі. Асаблівасці рэфармацыйнага руху ў розных дзяржавах. Рэлігійныя войны. Контррэфармацыя. Ордэн езуітаў і яго дзейнасць на тэрыторыі ВКЛ.

Эпоха Асветніцтва. Сутнасць і асноўныя ідэі Асветніцтва. Асаблівасці Асветніцтва ў асобных еўрапейскіх краінах. Уплыў Асветніцтва на ўяўленні аб адносінах улады і грамадства. Асаблівасці палітыкі асветніцкага абсалютызму. Уплыў ідэй Асветніцтва на культуру і грамадска-палітычную думку Усходняй Еўропы. Уплыў Заходняй Еўропы на культурныя працэсы ў Расіі. Ідэі Асветніцтва ў расійскай грамадскай думцы. Культура Усходу ў эпоху еўрапейскага Асветніца.

Палітычнае развіццё Беларусі ў XVI–XVIII стст. Дзяржаўны лад ВКЛ у першай палове XVI ст. Статуты ВКЛ 1529, 1566 гг. Судовая сістэма ВКЛ у XVI ст. Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай. Барацьба ВКЛ за самастойнасць. Статут ВКЛ 1588 г. Прычыны ўнутрыпалітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай. Спробы рэформ. Падзелы Рэчы Паспалітай.

Беларусь у еўрапейскіх войнах ранняга Новага часу. Лівонская вайна і яе наступствы. Ваенныя канфлікты Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай у XVII ст. Казацка-сялянская вайна на тэрыторыі Беларусі. Паўночная вайна і яе наступствы для Беларусі. Вайна за польскую спадчыну. Сямігадовая вайна. Войны з Асманскай імперыяй.

Эканамічнае становішча Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст. Перадумовы і асаблівасці станаўлення фальварачна-паншчыннай гаспадаркі на беларускіх землях. "Валочная памера", яе значэнне і наступствы. Гарады, іх функцыі, заняткі насельніцтва. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVII–XVIII стст. Эканамічны заняпад і дэмаграфічны спад. Шляхі пераадолення крызісу. Сацыяльныя супярэчнасці. Зараджэнне капіталістычных адносін. З'яўленне мануфактур. Магнацкае прадпрымальніцтва. Спробы эканамічнага рэфармавання ў другой палове XVIII ст. Роля Беларусі ў еўрапейскай эканоміцы.

Рэфармацыйны рух і Контррэфармацыя ў ВКЛ. Канфесійная сітуацыя ў ВКЛ у пачатку XVI ст. Асаблівасці і напрамкі Рэфармацыі ў ВКЛ. Контррэфармацыя ў ВКЛ.

Канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI – XVIII стст. Палажэнне Праваслаўнай царквы ў другой палове XVI ст. Ідэя зближэння праваслаўнай і каталіцкай цэркваў і яе ўспрыманне грамадствам ВКЛ. Заключэнне Брэсцкай царкоўнай уніі. Станаўленне уніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі. Адыход ад верацярпімасці. Канфесіі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст.

Гуманізм і Адраджэнне на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, асветнік, філосаф і гуманіст. Паслядоўнікі Францыска Скарыны. Дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння.

Развіццё адукацыі і навуковых ведаў у Беларусі. Сістэма адукацыі ў XVI–XVII стст. Праваслаўныя брацтвы. Езуіцкія калегіумы. Віленская езуіцкая акадэмія. Выхадцы з Беларусі ва ўніверсітэтах Еўропы. Грамадска-палітычная думка ў XVI–XVII стст. Сімяон Полацкі. Эпоха Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі. Рэформы Эдукацыйнай камісіі. Навукоўцы – ураджэнцы Беларусі ў XVIII ст. Развіццё навуковых ведаў у XVII–XVIII стст.

Культура Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст. «Сарматызм» і барока ў беларускай культуры канца XVI – XVIII ст. Ідэалогія сарматызму і яе праявы ў культуры шляхты ВКЛ. Кніжная справа і літаратура. Архітэктура. Скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў эпоху барока. Выяўленчае мастацтва. Музыка і прыгонны тэатр. Народная культура. Працэсы паланізацыі насельніцтва Беларусі.

Урок-практыкум.

Урок абагульнення.

Урок «Наш край».

Праектная дзейнасць.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: абсалютызм, Адраджэнне (Рэнесанс), Асветніцтва, асветніцкі абсалютызм, буржуазная рэвалюцыя, дысідэнты, каланіялізм, капіталізм, Контррэфармацыя, паланізацыя, пратэкцыянізм, рэлігійная вайна, Рэфармацыя, сарматызм, фальварак, фальварачна-паншчынная сістэма;

асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага развіцця Беларусі ў першы перыяд Новага часу;

культурную спадчыну Беларусі, іншых рэгіёнаў свету ў першы перыяд Новага часу;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаемыя падзеі, з’явы, працэсы;

сінхранізаваць падзеі, з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў вывучаемы перыяд;

лакалізаваць у прасторы гістарычныя падзеі, з’явы, працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў першы перыяд Новага часу; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў першы перыяд Новага часу;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: абсалютызм, Адраджэнне (Рэнесанс), Асветніцтва, асветніцкі

абсалютызм, буржуазная рэвалюцыя, дысідэнты, каланіялізм, капіталізм, Контррэфармацыя, паланізацыя, пратэкцыянізм, рэлігійная вайна, Рэфармацыя, сарматызм, фальварак, фальварачна-паншчынная сістэма; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з'яў, працэсаў);

характарызаваць палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, канфесійнае, культурнае развіццё Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў першы перыяд Новага часу, вынікі дзейнасці гістарычных асоб з апорай на розныя крыніцы інфармацыі; пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі з'явамі і працэсамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў першы перыяд Новага часу;

параўноўваць гістарычныя з'явы і працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету ў першы перыяд Новага часу, па самастойна выбраных крытэрыях і фармуляваць аргументаваныя вывады;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання аб палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесійным, культурным развіцці Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў першы перыяд Новага часу;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб развіцці Беларусі і іншых рэгіёнаў свету ў першы перыяд Новага часу па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесійным і культурным развіцці Беларусі ў першы перыяд Новага часу, гістарычных асобах, падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, інтэрнэту і іншых);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях развіцця Беларусі ў першы перыяд Новага часу і яе месцы ў сусветным гістарычным працэсе;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у СМІ;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных фактаў і асоб;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, даследчых работ, апісання і тлумачэння іх вынікаў;

усвядомленых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай агульнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Выніковае абагульненне (1 гадзіна).